20 год Гродзенскай дыяцэзіі (36)

Аўтар: Рэдакцыя
02.11.2012 01:00

2009 год

Снежань - З'явіўся новы дыск семінарыйнага гурта AVE "Bóg się rodzi".
24 снежня - У раённым Доме культуры ў Іўі адбыўся VII Дэканальны конкурс калядак і пастараляў.

2010 год

14 лютага - Кс. бп Аляксандр асвяціў Манаскі дом і касцёл у Гродне на Дзевятоўцы. У малітве прыняў удзел а. правінцыял Рышард Божэк. † 23 сакавіка - Кс. бп Аляксандр Кашкевіч прызначыў парафіяльны касцёл у Капцёўцы марыйным санктуарыем.
27 сакавіка - Кс. бп Аляксандр у Сапоцкіне адправіў св. Імшу з нагоды першай гадавіны смерці кс. Уладыслава Мяшчанскага.
11 красавіка - У парафіяльным касцёле ў Лідзе ў мікрараёне Слабада адбылося асвячэнне абраза МБ Вастрабрамскай. Абраз асвяціў кс. бп Антоній Дзям'янка.
17 красавіка - У новай капліцы ў Гродзенскай абласной бальніцы кс. бп Аляксандр Кашкевіч адправіў першую св. Імшу.
26 красавіка - У семінарыйнай капліцы была адпраўлена ўрачыстая св. Імша з нагоды святкавання 80-годдзя кс. праф. Тадэвуша Вышынскага.
2 мая - Упершыню з Ашмян у санктуарый у Барунах вырушыла Пешая пілігрымка маці.
8 мая - У касцёле св. Андрэя ў Слоніме кс. бп Антоні Пацыфік Дыдыч удзяліў святарскія пасвячэнні дк. Віталію Бандаронку (OFMCap).
7 – 9 мая - У Шчучыне адбыліся Дыяцэзіяльныя дні моладзі пад дэвізам: "Езус Хрыстус – мой Настаўнік".
16 мая - Кс. бп Аляксандр у Жалудку адправіў св. Імшу з нагоды 520-годдзя парафіі і асвяціў фігуру св. Яна Хрысціцеля.
20–21 мая - У будынку ВДС у Гродне адбыўся навуковы сімпозіум на тэму: "Дар і Таямніца. Год святарства".
29 мая - У гродзенскай катэдры адбыліся пасвячэнні дыяканату і прэзбітэрату. Кола прэзбітэрату павялічылася на 5 новых ксяндзоў і 1 дыякана.
30 мая - З Ашмян у Баруны вырушыла I Пешая пілігрымка бацькаў.